# МАТЫЎ НЕБЯСПЕЧНЫХ ВЕДАЎ У ТВОРАХ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА

З часоў старажытнай літаратуры кніга з’яўлялася сакральным вобразам. Яна лічылася ўвасабленнем скразной для нацыянальна-культурнага развіцця ідэі асветніцтва, сапраўдным настаўнікам і выхавацелем чалавечых душ. Праз кнігу пралягаў шлях да спасціжэння вышэйшай мудрасці і духоўнага ўдасканалення. Расчараваныя вынікамі рацыяналістычных ідэй XVIII стагоддзя рамантыкі ўнеслі ў гэту традыцыю свае карэкцівы. Пратэст супраць прагматычнай цывілізацыі, якая пайшла па шляху навукова-тэхнічнага прагрэсу, нарадзіў недавер і насцярожанасць да кнігі як ёмішча тых самых навуковых ведаў і рацыяналістычных ідэй. Функцыю выхавацеля эмацыянальна-пачуццёвага свету ў рамантычнай літаратуры ў асноўным узяла на сябе некранутая прырода, якая малявалася ва ўсёй сваёй велічнай першабытнасці. Духоўная цэласнасць, аўтэнтыка чалавека, яго прыроднае атачэнне знаходзіліся пад пагрозай разбуральнага ўздзеяння няспыннага навуковага прагрэсу, нястрыманага імкнення спасцігнуць і выкарыстаць таямніцы прыроды. Такім чынам, кніга як скарбніца ведаў выглядала ў рамантычных творах спакуслівай і небяспечнай.

Матыў небяспечнасці кніжных ведаў праходзіць праз зборнікі навел Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» і «Драўляны дзядок і кабета Інсекта». Галоўны герой, пан Завальня, – патрыярхальны шляхціц і кансерватар, але ягоны кансерватызм прасякнуты гуманістычным пафасам. У яго сядзібе, адасобленай ад агрэсіўнага ўздзеяння лясамі і возерам, пануе дабрачыннасць, сардэчнасць, чалавекалюбства – якасці, рэдкія ў надыходзячай рэчаіснасці. Невыпадкова для гэтага ідылічнага аазіса час спыніўся. Паказальна, што тут няма гадзінніка, які турбаваў бы гаспадара сваім імклівым бегам і нагадваў пра змены, непрымальныя для яго чулай і сентыментальнай натуры. Герой Баршчэўскага нібы выпадае з агульнага руху часу, уладкоўваючы жыццё свайго дому па старасвецкіх завядзёнках. Пан Завальня вобразна называе свой дом портам на беразе мора, процiпастаўляючы сваё жытло вялікаму свету з беспрытульнымі блуканнямі і бясконцай дарогай, якая набывае метафарычны характар і асацыіруецца з жыццёвым шляхам як адвечнай пілігрымкай. Свечка, у непагадзь запаленая на падаконніку дабрачынным гаспадаром, выглядае тым выратавальным маяком, што прыцягвае падарожных спыніцца ў кутку, дзе яшчэ захаваліся хрысціянскія каштоўнасці. У творах Я. Баршчэўскага хрысціянскае і старасвецкае – тоесныя паняцці, антаганістычныя новаму

часу. Пісьменнік падкрэслівае пазачасавасць прынцыпаў быцця свайго героя, універсальнасць яго жыццёвых установак. Адмаўленне пісьменнікам прагрэсу вынікае ад страху перад дэгуманізацыяй чалавека, занядбаннем і разбурэннем яго боскай сутнасці.

Навукова-тэхнічнае развіццё цягне за сабой немінучы разрыў з традыцыямі, у аснове якіх ляжыць напрацаваны вопыт пакаленняў як эмпірычны, так і духоўны, таму прагрэс бачыцца пісьменніку разрывам з сфарміраванай у часе сістэмай маральна-этычных каштоўнасцяў і нацыянальнай самабытнасцю. Станоўчы, пазітыўны характар кансерватызму пана Завальні бачыцца не толькі ў захаванні духоўных асноў, старадаўніх звычаяў і традыцый, але і ў абароне таго, што можна пазначыць як этнакультурную аснову Беларусі.

Тэхнічны прагрэс у кнізе Баршчэўскага разглядаецца з пункту гледжання шляхціца-землеўласніка і адназначна асэнсоўваецца як разбуральны, варожы для прыроднага атачэння і чалавечай супольнасці. Ён звязаны з прагай большых матэрыяльных выгод, а чалавек пачынае разглядацца выключна з пазіцый рацыянальнай значнасці. Пры гэтым знішчаецца аптымальная і найбольш гуманная з пункту гледжання пісьменніка сістэма ўзаемаадносін паміж панамі і сялянамі як паміж бацькамі і дзецьмі ў вялікай патрыярхальнай сям'і. Паказальным выглядае аповед пра пана, які захацеў пабудаваць у сваёй вёсцы суконную фабрыку і меркаваў, што з гэтага здабудзе залатыя горы, але ў выніку фабрыка заняпала, а сяляне, даведзеныя да крайняй галечы, мусілі пакінуць свае хаты і пайсці блукаць па свеце. Няшчасным людам была складзена і адпаведная песня: *Нет хлеба, солі, // Нет шчасця долі. // Поле пусцеець – // Няма чым сеяць. Не будзем жыці // Пойдзем блудзіці* [1, с. 146]. Пан ігнараваў папярэджванні сваіх дабрачынных суседзяў, што паляпшэнне жыцця трэба пачынаць з добраўладкавання сваёй зямлі: *Не з фабрык трэба пачынаць грамадзянам беларускім, каб палепшыць свой быт, а з зямлі, бо сялянская гаспадарка найбольш прыносіць карысці ў нас; трэба рупіцца разводзіць жывёлу, угнойваць палеткі, павялічваць сенажаці і падданых сваіх навучыць лепшым маральным канонам, каб любілі сваю бацькаўшчыну* [1, с. 145].

Як трапна заўважыў П. В. Васючэнка, «Каляндар – адзіная кніга, пасля "Бібліі", якую прызнае і чытае шляхціц Завальня. У "Бібліі" ён, як і крывіч Скарына, знаходзіць амаль усё, што патрэбна для душы і розуму. Усю астатнюю мудрасць – гаспадарчыя парады, назіранні за прыродай і колькі займальных гісторый – змяшчае ў сябе "Каляндар". Гэта – той мінімум тэксту, які патрэбен чалавеку аўтэнтычнаму, які жыве ў згодзе з Богам, прыродай і людскімі законамі…» [2, с. 27]. Неаднаразова сам гаспадар і яго госці дэманструюць сваё ўменне чытаць Кнігу прыроды і па дробных прыкметах прадказваць заўтрашняе надвор'е ці будучы ўраджай,

бо *дасведчаны гаспадар на кожную рэч павінен зважаць*. Найперш прыродныя, а не сацыяльна-грамадскія з'явы вызначаюць лад жыцця пана Завальні, не гадзіннік, а крык пеўня ёсць тым таймерам, што адмярае яму час дня і ночы.

Як узорны хрысціянін, пан Завальня далёкі ад цемрашальства і з павагай ставіцца да асветы і адукацыі, шчыра радуецца поспехам у навуцы сваіх сыноў, Стася і Юзіка. Пляменнік Янка, выпускнік Полацкай езуіцкай акадэміі, сваёй начытанасцю выклікае ў яго пашану: *О, не кепска быць чалавекам вучоным! От, як вашэць апавядаеш з розных кніжак, таго невук і ў сне не ўбачыць! Добра ўсё ведаць* [1, с. 92]. З другога боку, на мудрагелістыя аповеды пляменніка з антычнай міфалогіі, «Адысеі» ды «Энеіды», якія той расказвае доўгімі зімовымі вечарамі, пан Завальня рэагуе без асаблівай цікавасці: *І такому вас вучаць езуіты ў школах, навошта ж гэта прыдасца?* [1, с. 21]. Пасля кніжнай схаластыкі Янка ў дзядзькавым доме атрымлівае актуальныя, практычныя веды і набіраецца мудрасці жыцця, слухаючы не толькі аповеды падарожных, але і філасофскія сентэнцыі пана Завальні. Дзядзькава філасафема – *Цуды можна разумець сэрцам, а не навукаю* – можа служыць асноўным арыенцірам у этычным пазнанні свету. Ёй сугучны думкі аднаго з дзядзькавых гасцей, арганістага з Расонаў пана Андрэя, які таксама некалі скончыў езуіцкую школу, нават перакладаў прамовы Цыцэрона, але потым зразумеў, што гэта ўсё *vanitas vanitatis, не захацеў паглыбляцца ў далейшыя мудрасці; навошта філасофстваваць, лепш верыць сэрцу* [1, с. 182].

Кніжная вучонасць у творах Я. Баршчэўскага не прыносіць шчасця анікому, наадварот, яго гісторыі толькі пацвярджаюць словы Эклезіяста: «У вялікай мудрасці шмат *смутку*, і той, хто *памнажае веды, памнажае* тугу». Са скрухай пан Завальня рыхтуецца развітацца з пляменнікам, бо той наважыўся пакінуць родны кут: *Вось што такое навука! Ужо неспакойны, хочаш яшчэ больш даведацца і лятаеш думкамі недзе там, далёка, хочаш бачыць вялікі свет, і таму цесна табе тут з намі…Даўней наша моладзь не ведала і ведаць не хацела, што там дзеецца дзесьці ў далёкіх краінах, жылі ўсе спакойна і шчасліва, цяпер і на адукаваных нападае нейкі смутак: ледзь закончыў вучобу – ужо яму самотна, пакідае родныя палеткі, выпраўляецца ў далёкае падарожжа, мяркуючы, што чужы вецер развее яго неспакойныя думкі* [1, с. 253–254]. З кнігі «Драўляны дзядок і кабета Інсекта» відаць, што праз сямнаццаць год пляменнік Янка вяртаецца на радзіму самотным, беспрытульным падарожнікам.

У многіх навелах Я. Баршчэўскага ўвасоблены матыў небяспечнасці кніжнай схаластыкі, кніжных ведаў або ўяўнай вучонасці, бо яны нараджаюць ілюзію ўсёведання, усемагутнасці, непамерную самаўпэўненасць, якая рана ці позна прыводзіць да самаразбурэння чалавека, як гэта прадэманстравана

аўтарам у навеле «Горды філосаф». Герой твора ганарыцца начытанасцю антырэлігійных кніг французскіх філосафаў, здзіўляе суседзяў сваёй адукаванасцю, моладзь цягнецца да яго, *каб паслухаць пра высокія матэрыі… Ён апавядаў пра цуды, тлумачыў таямніцы прыроды, якіх сам не разумеў.* І хаця старыя людзі папярэджваюць, *якая ж праўда вышэйшая за праўду веры?.. Чалавечы розум няхай супакоіцца, бо гэта за мяжой яго разумення,* Філосаф у сваім уяўным усяведанні заганарыўся [1, с. 317]. Мізэрнасць чалавека, марнасць яго ведаў і бездапаможнасць розуму перад абліччам Бога і вечнасці паказваюцца пісьменнікам з дапамогай сімвалічных метамарфозаў Філосафа. На вачах у людзей яго мудрая галава раптам пераўтвараецца ў маленькі шарык, падобны на макавую галоўку. У касцёле, куды ён патрапіў выпадкова, дужы Філосаф змяншаецца ў памерах і становіцца роўным з дзіцячую драўляную лялькy. Перасцярога аўтара відавочная: натура, у тым ліку і духоўная натура чалавека, не цярпіць пустаты. Адкідаючы духоўныя прыярытэты, высмейваючы маральныя законы, Філосаф прыцягвае цёмныя сілы і канец яго сумны. Яго пачынаюць пераследаваць прывіды і іншыя жахі, і ўрэшце ён, знерваваны, паміpae ад страху, калі на сцяне раптам пераламілася асада з партрэтам дзеда-нябожчыка.

Ян Баршчэўскі стварае цэлы шэраг сітуацый, якія папярэджваюць чытача аб небяспецы залішняй цікаўнасці і імкненняў зведаць тую сферу іншабыту, якую чалавек не ў стане спасцігнуць і тым больш кіраваць ёю. Аўтар неаднаразова падкрэслівае: не лезь безаглядна туды, чаго не ведаеш, бо невядома, чым гэта скончыцца. Адзін з герояў кнігі «Шляхціц Завальня» Адольф, апантаны прагай дазнацца будучыні, з дапамогай жабер-травы адпраўляецца ў падарожжа па часе. Паказальна, што з гэтай вандроўкі ён так і не вярнуўся. Невыпадкова гэта адзіны сюжэт, які мае ў кнізе адкрытую канцоўку: аповед пра Адольфа перапыняецца прыездам чарговага госця, і гэта гісторыя застаецца няскончанай.

Матыў небяспечных ведаў цесна звязаны ў творах Баршчэўскага з чарнакніжніцтвам. Кароткае знаёмства шкаляра Гугона з тэкстам старажытнай кнігі, знойдзенай у пакоі містычнага чараўніка пана Твардоўскага, прыводзіць шкаляра да смерці, а ў яго мёртвае цела засяляецца злы дух. Вобраз Чарнакніжніка з’яўляецца скразным для твора Баршчэўскага. Ён адначасова носьбіт таемных, забароненых ведаў і ўвасабленне непераможнага зла. Чарнакніжніка сярод шматлікіх міфалагічных істот, якія багата насяляюць творы Я. Баршчэўскага, вылучае тая акалічнасць, што «чарнакніжніцтва – з’ява цывілізацыйная, а не міфалагічная» [2, с. 34]. Чарнакніжніцтва народжана рацыяналізмам, паклікана да жыцця далёка не самымі высакароднымі памкненнямі: задавальненнем жаданняў прагматычных і эгаістычных, у першую чаргу прагай багацця і ўлады.

У навелах Я. Баршчэўскага нават ненаўмысны саюз з Чарнакніжнікам прыводзіць да таго, што героі становяцца паслухмянай цацкай у руках цёмных сіл. Шляхта верыць Чарнакніжніку як вучонаму чалавеку, а веру і традыцыі народа трымае за неадукаванасць і цемрашальства, але ў выніку горка расплочваецца за свае памылкі. Так, у навеле «Валасы, якія крычаць на галаве» Чарнакніжнік пры сустрэчы з панам Генрыкам прэзентуе сябе вучоным чалавекам, які дазнаўся пра самыя пакрыёмыя таямніцы прыроды, змагаром з людскімі забабонамі і невуцтвам. Пастулова Чарнакніжнік бярэ ўладу над Генрыкам, прыкрываючы барацьбу супраць традыцыйных каштоўнасцей размовамі пра практычныя выгоды: *Пакінь сумнявацца. Ты чалавек – і ўсё павінна служыць табе* [1, с. 213]. Атрута глыбока пранікае ў душу Генрыка – пастулова знікае каханне да жонкі, спагада да сялян, нараджаецца чэрствасць, жорсткасць, адчуванне ўседазволенасці. Разрыў з духоўнымі традыцыямі засведчаны ў красамоўным эпізодзе: па парадзе Чарнакніжніка, нібыта каб палепшыць выгляд наваколля, ён загадвае разбурыць старыя могілкі, цэглу з-пад капліцы пусціць на падмурак для новага дому, а на месцы магіл пасеяць авёс, каб і знаку не засталося ад знішчанай святыні.

У творах Яна Баршчэўскага кніжныя веды супрацьпастаўляюцца духоўным набыткам і аказваюцца варожымі, небяспечнымі, разбуральнымі для чалавека і яго натуральнага атачэння. З вуснаў пана Завальні і іншых дабрачынных герояў няспынна гучыць заклік да асцярожнасці, абачлівасці ў іх выкарыстанні, арыентацыі на маральныя прынцыпы пры спасціжэнні чалавекам таямніц быцця: *Няхай жа ён навучыцца пазнаваць і любіць тое, што ёсць дабро. А тады Бог зробіць яго годным уладаром зямных скарбаў* [1, с. 134]. Пісьменнік адмаўляе як кніжную схаластыку, так і рацыяналізм мыслення, але пры гэтым шануе Біблію як скарбніцу духоўнай веды, прызнае практычны досвед земляроба, які дазваляе жыць у гармоніі з прыродай, не парушаючы яе законаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Баршчэўскі, Я.* Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі; уклад., пер. з пол. мовы і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 383 с.
2. *Васючэнка, П. В.* Адлюстраванні першатвора / П. В. Васючэнка. – Мінск, 2004. – 144 с.


*Матэрыялы артыкула друкаваліся [у] : Бурдзялёва, І. А. Вабнасць і спакусы кнігі ў творах Яна Баршчэўскага / І. А. Бурдзялёва // XII Міжнар. навук. канф. «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай», 22–24 кастрычніка 2015 г. : у 2 ч. Ч. 1. – Мінск : Выд. цэнр БДУ, 2016. – С. 332–338.*